

# «КАЛІ БУДЗЕ РАШЭННЕ, МЫ АДРАЗУ ПАЧНЁМ НОВЫ ЭНЕРГАБЛОК АБО НОВУЮ СТАНЦЫЮ СТАВІЦЬ»

**Што Прэзідэнты Беларусі і Расіі абмяркоўвалі ў Крамлі**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
27 ВЕРАСНЯ 2025 г. СУБОТА № 187 (30575)

# ЭЛЕКТРАКАРЫ, МАШЫНЫ БЕЗ КІРОЎЦЫ І НА ВАДАРОДЗЕ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Яскравыя трэнды машынабудавання**

СТАР. 8–9



БЕЛАРУСЬ СТАЛА ДАРАГОЙ І БЛІЗКАЙ

10

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X
25187

60+: ЖЫЦЬ ЦІКАВА!

## СУМАВАЦЬ НЕ ДАВЯДЗЕЦЦА

**Чым можна разнастаіць жыццё на пенсіі**



Уключэннем пажылых людзей у жыццё грамадства і стварэннем умоў для рэалізацыі іх патэнцыялу займаюцца тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Прычым спіс заняткаў, якія прапануюць, вельмі доўгі. У ТЦСАН Савецкага раёна Мінска, напрыклад, людзі сярэбранага ўзросту вывучаюць мовы, займаюцца спортам, ёгай, танцамі і не толькі. Карэспандэнт «Звязды» паназірала за заняткамі і ўпэўнілася: гэта сапраўды цікава!

СТАР. 12

# «КАЛІ БУДЗЕ РАШЭННЕ, НОВЫ ЭНЕРГАБЛОК АБО

## Што Прэзідэнты Беларусі і Расіі

Другі дзень рабочага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Расію быў прысвечаны беларуска-расійскаму супрацоўніцтву. У пятніцу Прэзідэнт сустрэўся са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Беларускі лідар адзначыў, што хацеў бы абмеркаваць з расійскім Прэзідэнтам шэраг рэгіянальных праблем. «Ёсць пара пытанняў, па якіх мы звычайна ў канцы года вызначыцца павінны. Нават адно пытанне. Гэта ў двухбаковых адносінах», — дадаў ён.



Фота БелТА.

### «ВЫ НАВУЧЫЛІ НАС БУДАВАЦЬ АТАМНЫЯ СТАНЦЫІ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на размовы аб тым, што Прэзідэнты часта сустракаюцца, падкрэсліўшы: з расійскім лідарам ён ужо даўно не сустракаўся. «Назапасілася куча пытанняў, якія мы сёння абмяркуем. І прымем адпаведныя рашэнні», — сказаў беларускі лідар.

Адно з пытанняў стала працягам тэматыкі глабальнага атамнага форуму, у якім Прэзідэнты прынялі ўдзел напярэдадні. «Калі вы ўхваліце праект пашырэння або будаўніцтва новай атамнай станцыі. Можа быць, нават на ўсходзе Беларусі з мэтай, калі будзе неабходна, забеспячэння электраэнергіяй рэгіёнаў, вызваленых Расіяй, — Херсонскай, Запарожскай, Луганскай, Данецкай абласцей. Калі ў гэтым будзе пэўная неабходнасць. У сувязі з Запарожскай станцыяй, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**— «Расатам» ужо прапрацаваў варыянты далейшага пашырэння нашай атамнай энергетыкі. Я не хачу публічна гаварыць пра фінансы. У нас ёсць варыянты, я скажу вам пра гэта. Калі будзе рашэнне, мы адразу пачнём новы энергаблок або новую станцыю ставіць, калі будзе патрэба на захадзе Расіі і ў вызваленых рэгіёнах».**

«Пытанне з фінансаваннем наогул не стаіць. Калі ёсць спажывец, які будзе браць электраэнергію і плаціць патрэбны тарыф, гэта наогул не праблема», — адказаў Уладзімір Пуцін. Аляксандр Лукашэнка з гэтым цалкам пагадзіўся.

Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што ў савецкі час многае рабілася разам для развіцця атамнай галіны.

**«Але і сёння мы не разбегліся. І атамную станцыю мы дзякуючы вам пабудавалі. Больш за тое, вы выканалі сваё абяцанне — навучылі нас будаваць атамныя станцыі. Мы сёння з «Расатамам» будуем у іншых краінах атамныя станцыі, — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

— Адзінае, у што мы не акунуліся (але, калі трэба будзе, мы гатовыя разгледзець і гэтыя пытанні), — звярыць рэактар, корпус ці яшчэ нейкія неабходныя дэталі і камплектуючыя. Пакуль такой неабходнасці няма. «Расатам» на сваіх расійскіх заводах гэта робіць. А будаўнікі ў нас добрыя, расіяне вельмі задаволеныя нашымі будаўнікамі, іх нямала працуе». Прэзідэнт падкрэсліў, што напрацаваныя сумесна кампетэнцыі будуць выкарыстоўвацца на карысць Беларусі і Расіі.

**Аляксандр Лукашэнка расказаў, як БелАЭС паўплывала на развіццё краіны, хоць спачатку асцерагаліся лішку электраэнергіі. Аднак наяўнасць дадатковых аб'ёмаў электраэнергіі пацягнула развіццё цэлых кірункаў, уключаючы эканоміку краіны. Усё больш з'яўляецца электрамабіляў, будуюцца зарадныя станцыі. «Самае галоўнае, што мы праэксперыментавалі ўжо, — жылыя дамы перавялі на электрычнасць», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.**

Уладзімір Пуцін у сувязі з гэтым адзначыў, што ёсць таксама магчымасць больш актыўна развіваць сферу штучнага інтэлекту, ствараць дата-цэнтры.

«У нас станцыі, якія былі на газе, мы ў халодным рэжыме (падтрымліваем работу. — **«Зв.»**). Мы там якраз размясцілі — майнінг ажыццяўляем і гэтак далей. Замежнікі плацяць грошы ў бюджэт, і гэтыя станцыі працуюць.

**Таму мы ў «Газпрама» практычна закупляем і будзем закупляць тыя ж аб'ёмы газу. Я думаю, што «Газпрам» страты тут не панясе. Усюды сёння патрэбны прыродны газ», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.**

### ПА ЎСІХ КІРУНКАХ ІДЗЕ АКТЫЎНАЯ РАБОТА

Кіраўнік расійскай дзяржавы ў першую чаргу падзякаваў беларускаму калегу за ўдзел у глабальным атамным форуме, прысвечаным 80-годдзю атамнай прамысловасці Расіі. «Па сутнасці, гэта наша агульнае свята. Па-першае, таму што гэта 80 гадоў утварэння атамнай галіны ў СССР і мы былі разам у гэты час. А па-другое, на сёння Беларусь стала нашым сур'ёзным партнёрам у галіне атамнай энергетыкі, паколькі створана першая АЭС у Беларусі і, больш за тое, узнікла галіна ў Беларусі, спецыялісты якой цяпер разам з «Расатамам» працуюць нават над узвядзеннем атамных аб'ектаў у трэціх краінах. І гэта, вядома, не можа не радаваць», — сказаў Уладзімір Пуцін. Ён згадаў, што, па даных беларускага боку, каля 40 % электрычнасці ў краіне выпрацоўваецца Беларускай атамнай электрастанцыяй. За кошт гэтага адбываецца істотная эканомія іншых энергарэсурсаў, у тым ліку прыроднага газу. «Стварылі канкурэнта для «Газпрама», які пастаўляў проста першасны энерганосьбіт, і Беларусь купляла. Цяпер таксама

# МЫ АДРАЗУ ПАЧНЁМ НОВУЮ СТАНЦЫЮ СТАВІЦЬ»

**абмяркоўвалі ў Крамлі**

купляе, але, вядома, патрэбы скараціліся ў гэтым сэнсе», — заўважыў Прэзідэнт Расіі.

Што тычыцца эканамічнай сферы, то Уладзімір Пуцін назваў сітуацыю вельмі добрай.

**«Гэта нешта дзіўнае: звыш 50 мільярдаў долараў у нас тавараабарот, і ён ад такой вялікай базы працягвае расці (рост назіраўся ў 2024-м і працягваецца, мяркуючы па даных за мінулы перыяд 2025-га. — Зв.)», — звярнуў увагу ён, дадаўшы, што Расія па назапашаных інвестыцыях (4,5 мільярда долараў) лідзіруе сярод гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі.**

«Увогуле, фактычна па ўсіх кірунках у нас актыўная работа ідзе», — падкрэсліў Прэзідэнт Расіі. Тое ж самае, па яго словах, датычыцца і пытанняў забеспячэння бяспекі Саюзнай дзяржавы. «Тут, як мы з вамі і дамаўляліся, усё рытмічна, у рабочым рэжыме. Натуральным чынам усё развіваецца».

«Хачу Вам падзякаваць за такое ўважлівае стаўленне да ўсіх кірункаў нашага ўзаемадзеяння. Я вельмі рады вас бачыць», — сказаў расійскі лідар, звяртаючыся да Прэзідэнта Беларусі.

## «ГАЛОЎНАЕ Ў ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ – МІР, МІР, МІР»

**Інсайды і заявы ад Прэзідэнта Беларусі**

Перагаворы Прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ў Крамлі працягваліся 5 гадзін 22 хвіліны. Некаторыя падрабязнасці размовы Аляксандр Лукашэнка расказаў журналістам. Прэзідэнт Беларусі нічога не хаваў ад прадстаўнікоў СМІ, якія скарысталіся магчымасцю задаць яму некалькі пытанняў.

**Журналісты заўважылі, што перагаворы з расійскім калегам працягваліся доўга.**

«Рэдка сустракаемся. Колькі часу прайшло, не бачылі адзін аднаго», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што яны абмяркоўвалі і міжнародную абстаноўку, і рэгіянальную сітуацыю, якая складваецца. «Вы ж ведаеце, агульная наша бяда і праблема — Украіна. Шмат аб гэтым казалі, — раскрыў інсайды кіраўнік дзяржавы. — І вось скончылі двухбаковымі адносінамі, пытаннямі па нафце, па газе. Па нафце мы дамовіліся, у нас сур'ёзныя дамоўленасці, праблем ніякіх няма. Па газе выйшлі на дамоўленасці. Я думаю, пасля гэтай размовы мы дашліфуем гэтыя пытанні, ужо на пяцігодку практычна. Вось у чым было пытанне — не на адзін год, а на пяцігодку».

Аляксандр Лукашэнка распавёў, што гаварылі і аб агульным рынку, і аб яго абароне, мерах, якія трэба прымаць, каб даць магчымасць працаваць нашым таваравытворцам. «Мы калі сустракаемся, там маса пытанняў», — прызнаўся беларускі лідар.

### «ЗА СЭКАНОМЛЕНЫЯ СРОДКІ МОЖАМ ЦЭЛЫ ЭНЕРГАБЛОК ПАБУДАВАЦЬ»

**Падымалася і пытанне будаўніцтва другой атамнай станцыі ў Беларусі.**

«Мы сэканомілі прыстойна сродкаў на першай АЭС. І можам цэлы энергаблок за гэтыя сэканомленыя сродкі першага крэдыту пабудаваць», — адзначыў Прэзідэнт. Ён прызнаўся, што ёсць пэўныя асабістыя сумненні, ці будаваць трэці блок пры станцыі ў Астраўцы, ці размясціць яго на ўсходзе краіны. Спецыялісты і ўрад прапаноўваюць будаваць трэці блок побач са станцыяй, гэта будзе танней. «А з іншага боку, ведаеце, калі будуецца такі аб'ект, гэта дае развіццё цэламу рэгіёну. У мяне ёсць такія лёгкія ваганні, мы можам і там, і там будаваць. Думаю, мы вызначымся ў найбліжэйшы час», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. Адпаведныя даручэнні ўжо дадзены прэзідэнтамі ўрадам дзвюх краін — разам з «Расатамам» яны ўрэгулююць дэталі. «Калі не ўзнікне непрадаўладных абставін, мы будзем узводзіць трэці блок або новую атамную станцыю», — падсумаваў Прэзідэнт.

### «КІРАЎНІКАМ ТРОХ СЛАВЯНСКІХ ДЗЯРЖАЎ ТРЭБА СЕСЦІ І ДАМОВІЦЦА»

**Журналісты папрасілі Прэзідэнта пракаментаваць заявы кіраўніцтва Украіны наконт пагроз ударыць па Крамлі.**

«Гаварыць, заяўляць можна ўсё. А калі Крэмль ударыць па Банкавай (вуліца ў Кіеве, дзе размешчаны ўкраінскія органы ўлады — **«Зв.»**), што там застанецца? Таму Уладзіміру Аляксандравічу (Зяленскаму. — **«Зв.»**) трэба супакоіцца. Ёсць на стале добрыя прапановы. Мы з Прэзідэнтам Пуціным абмяркоўвалі. Я не стану пра іх казаць, Прэзідэнт сам скажа. Добрыя прапановы. Прапановы па Украіне, якія на Алясцы ў тым ліку былі пачутыя Дональдам Трампам, вывезеныя ў Вашынгтон для таго, каб падумаць і абмеркаваць. Вельмі добрыя прапановы. Калі ўкраінцы не пойдуць на гэтыя прапановы, гэта будзе тое, што было ў пачатку СВА. Гэта будзе яшчэ горш. Яны страцяць Украіну», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, варта было спыніцца яшчэ тады, у пачатку, тады б увесь усход быў украінскі, акрамя Крыма.

«Не, не спыніліся. Страцілі ўсход. Зараз не спыняцца (на маю думку, чалавека, які вельмі паглыблены ў гэтую сітуацыю) — яны страцяць усю Украіну», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар паведаміў, што разам з Уладзімірам Пуціным заслухаў даклад Генеральнага штаба Узброеных Сіл РФ, гэта быў селектар. «Уладзімір Уладзіміравіч нічога не хавае ад мяне, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — На ўсіх франтах, і асабліва на некаторых участках (я асабіста назіраю за гэтымі ўчасткамі) расіяне практычна захапілі буйныя населеныя пункты. Я так гляджу, чыста геаграфічна: а што далей? А далей ужо расійскую армію цяжка будзе спыніць. Таму, каб не страціць усю Украіну, Уладзімір Аляксандравіч павінен не проста размаўляць, а пагадзіцца на выгадныя для яго ўмовы, якія былі адобраны амерыканцамі. Яны ўзялі паўзу, каб падумаць, расіяне пагадзіліся».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хацеў бы проста пагаварыць з Уладзімірам Зяленскім. «У мяне ёсць, што яму сказаць. Думаю, настаў той час, калі мы павінны ўступіць у кансультацыі. У пачатку СВА казаў: нам, кіраўнікам трох славянскіх дзяржаў, трэба сесці і дамовіцца. Дамовіцца аб заканчэнні гэтай незразумелай вайны. Трэба дамовіцца. Не дамовімся — будзе дрэнна ўсім», — заявіў беларускі лідар.

### «ТОЕ, ШТО ЗАЯЎЛЯЕ ТРАМП, ТРЭБА РАЗУМЕЦЬ»

**Журналісты ўдакладнілі, ці захоўваецца настроенасць Дональда Трампа на ўрэгуляванне ўкраінскага канфлікту.**

«У Трампа такая тактыка: націснуць — адступіць, адступіць — націснуць, недзе напралом пайсці. Бунтар. У самым добрым сэнсе слова. Я сам мала адрозніваюся ад Трампа ў гэтым плане і сябе называю трампістам. Уладзімір Уладзіміравіч паважае Трампа, з павагай да яго ставіцца не меншай, чым я», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што цяпер у Трампа вельмі няпростая сітуацыя, нядаўна застрэлілі яго адданага прыхільніка. «Ён прыняў гэты сігнал і рэагуе адпаведным чынам. Таму тое, што заяўляе Трамп, трэба разумець. Усебакова трэба разумець. І не трэба на яго кідацца пасля любой заявы: «папяровы тыгр» ці яшчэ нешта. Не трэба», — параіў Прэзідэнт. Ён расказаў, што пахваліў «старэйшага брата» за спакойныя, узважаныя дзеянні ў адносінах з амерыканцамі. «Час усё расставіць на свае месцы. Блізкі час. Яшчэ раз кажу, што Трамп заняў вельмі добрую пазіцыю, прыстойную, — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае ў знешняй палітыцы — мір, мір, мір».



Фота БелТА.

# БУДАВАЦЬ ТАМ, ДЗЕ САПРАЎДЫ ТРЭБА

## У Віцебскай вобласці ў 2026 годзе будзе рабіцца стаўка на ўзвядзенне арэнднага жылля ў раёнах, дзе ёсць неабходнасць замацаваць кадры



Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў

Аб гэтым ішла размова на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама, у ходзе якога абмеркавалі пытанне развіцця будаўнічай галіны і праблемныя пытанні ў жыллёвым будаўніцтве. Асаблівую ўвагу ўдзялілі перспектывам жылбуда. «Пяцігодка 2021—2025 гадоў была арыентавана на аб'ёмныя паказчыкі. З мэтай паляпшэння ў цэлым эканамічнага складніка прымаецца план на наступную пяцігодку, і тут сыходзіць вектар у бок раёнаў і на якасны паказчык. Каб замацаваць кадры, неабходныя ў раёнах, стаўка робіцца больш на арэнднае жыллё», — адзначыў старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама Андрэй ГАЛЯКОВІЧ.

Ён зрабіў акцэнт, што будаўніцтва арэндных кватэр будзе ісці ў тых раёнах, дзе ў перспектыве з'явяцца патрэбныя кадры і дзе такім відам жыллёвага будаўніцтва не займаліся апошнія гады. У спіс на 2026 год ужо ўключаны Бешанковіцкі, Талачынскі, Лёзненскі і Дубровенскі раёны, дзе, паводле інфармацыі Мінпрацы, для замацавання кадраў трэба вырашаць жыллёвае пытанне. Акрамя таго, кіраўнікам раёнаў даручана вызначыць, спецыялісты з якіх сфер маюць патрэбу ў жыллі, каб разумець, колькі трэба пабудаваць кватэр.

**Старшыня аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** падкрэсліў, што гэта пытанне трэба прапрацаваць комплексна і будаваць жыллё не для галачкі, а шукаць пункты росту, аналізаваць, дзе і хто больш мае патрэбу ў арэндных кватэрах.

Сёлета перад будаўнікамі стаіць задача ўзвесці ў цэлым 400 тысяч кв. м жылля. Па стане на студзень — жнівень, уведзена ў эксплуатацыю амаль 186 тысяч кв. м жылля, што не дасягае нават 50 % ад гадавога плана. Андрэй Галяковіч расказаў, што адставанне будзе навёрставацца за кошт будаўніцтва ў раёнах. Цяпер у вобласці ўзводзяць 28 шматкватэрных дамоў.

Андрэй Галяковіч адзначыў і яшчэ адно праблемнае пытанне ў індывідуальным будаўніцтве. Больш тысячы дамоў у раёнах стаяць пад дахам, гэта значыць, фактычна лічацца завершанымі, але з нейкіх прычын уладальнікі не хочуць рэгістраваць іх у БТІ, а значыць, гэта жыллё не трапляе ў афіцыйную статыстыку. Старшыня камітэта падкрэсліў, што на заканадаўчым узроўні ўздзейнічаць на такіх забудоўшчыкаў немагчыма, аднак спецыялісты ўжо ўнеслі прапанову ў галіновае міністэрства, каб перагледзець нарматывы ў актах прыёмкі індывідуальнага жылля. Гэта пытанне будзе абмяркоўвацца на высокім узроўні.

Па выніках пасяджэння **Старшыня Палаты прадстаўнікоў, упаўнаважаны кіраўніка дзяржавы па Віцебскай вобласці Ігар СЕРГЯЕНКА**, які прысутнічаў на абмеркаванні, у размове з журналістамі адзначыў: «Калі ў цэлым гаварыць аб рабоце Віцебскай вобласці на працягу пяцігодкі, то праглядаецца тэндэнцыя недавыканання плана будаўніцтва жылля штогод, пачынаючы з 2021 года. Таму сёння адбылася даволі патрабавальная размова. Вызначаны рэзервы, для таго каб і тэмпы, і тое заданне, якое было спланавана з улікам рэальнай абстаноўкі, былі выкананы. Ёсць сур'ёзныя задзелы, але ёсць і сур'ёзныя прэтэнзіі, у тым ліку да будаўнічага комплексу рэгіёна. Гэта і недастатковыя тэмпы будаўніцтва арэнднага жылля, у тым ліку для ваеннаслужачых і для патрэбных на месцах спецыялістаў. Размова ішла аб тым, каб глядзець на перспектыву — будаваць арэнднае жыллё там, дзе яно неабходнае і запатрабаванае, там, дзе ствараюцца вытворчасці, там, дзе трэба падтрымаць і замацаваць маладых спецыялістаў — медработнікаў, педагогаў, работнікаў сельскай гаспадаркі. Тэмп выканання пастаўленых задач зададзены, сёння было выказана меркаванне кіраўніка камітэта па будаўніцтве аб тым, што ўсё ж запланаваныя аб'екты будуць уведзены да канца года ў строй і людзі атрымаюць новае жыллё».

**Паводле БелТА і прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

# ДАПАМОГА ПРЫЕДЗЕ ПАЎСЮЛЬ

## У Гродзенскай вобласці да канца года ўсе раёны ў поўным аб'ёме будуць забяспечаны мабільнымі ФАПамі

На Гродзеншчыне ў рамках пасяджэння аблвыканкама абмеркавалі выкананне праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека на 2021—2025 гады». Вынікі паўгоддзя паказалі, што ёсць нагоды для радасці і гонару. Але разам з тым ёсць праблемныя моманты, якія патрабуюць сур'ёзнага комплекснага падыходу. Аб падрабязнасцях журналістам расказала начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Людміла КЕДА.



У першую чаргу Людміла Кеда звярнула ўвагу на значнае зніжэнне смяротнасці немаўлят, яна склала 1,3 праміле пры мэтавым паказчыку 3,0. Гэта найменшы вынік за апошнія гады і адзін з найлепшых у краіне. Таксама павялічылася колькасць шматдзетных сем'яў і знізілася колькасць абортаў. Сёння ў рэгіёне 12 172 шматдзетныя сем'і выхоўваюць траіх дзяцей, 1921 — чацвярых, 667 — пяцярых і болей. Самыя вялікія сем'і, у якіх выхоўваецца 11 дзяцей, пражываюць у Ваўкавыскім і Лідскім раёнах, 10 дзяцей — у Іўеўскім, Лідскім, Навагрудскім і Свіслацкім раёнах. Але разам з гэтым ёсць нагоды для турботы.

— На жаль, адбыўся значны рост дзіцячай смяротнасці з-за знешніх прычын. Гэта 44 % ад усіх смерцяў. У параўнанні з мінулым годам павелічэнне каласальнае, — расказала Людміла Кеда. — Сітуацыя патрабуе цеснага міжведамаснага ўзаемадзеяння, каб урэгуляваць гэтую праблему. Найбольшая колькасць дзяцей загінула ў ДТЗ. Летась такіх выпадкаў не было, сёлета — 4.






Вядома, станоўчых тэндэнцый значна больш. Сістэма аховы здароўя нарошчвае матэрыяльна-тэхнічную базу, рыхтуюцца да адкрыцця новыя аб'екты. Шэраг ужо ўвялі ў эксплуатацыю. У 2025 годзе запрацавалі новы інфекцыйны корпус у Слонімскай ЦРБ, дзіцячая паліклініка ў Ваўкавыску. Будынкі хуткай медыцынскай дапамогі пачалі работу пасля капітальнага рамонту ў Лідзе, былі адрамантаваны інфекцыйнае аддзяленне Шчучынскай ЦРБ і адміністрацыйныя памяшканні Дзятлаўскай ЦРБ. У Гродне адкрыты дзве новыя амбулаторыі. Чакаецца пастаўка чатырох камп'ютарных тамографаў і трох магнітна-рэзанансных.

У Гродзенскай вобласці актыўна развіваецца сістэма аказання медыцынскай дапамогі сельскаму насельніцтву. Сёння функцыянуе 110 амбулаторый урача агульнай практыкі, 197 стацыянарных і 15 перасоўных фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

— За апошнія гады значна павялічылася колькасць мабільных ФАПаў, і цяпер практычна ўсе раёны вобласці забяспечаны імі. Сёлета чакаецца пастаўка яшчэ 9 такіх пунктаў, што дазволіць абсталяваць усе раёны ў поўным аб'ёме. У некаторых рэгіёнах, дзе ёсць неабходнасць, плануецца дадаць па адным комплексе. Гэта забяспечыць яшчэ большую даступнасць медыцынскай дапамогі для насельніцтва.

Адмысловая ўвага надаецца выязным формам працы. На перасоўных пунктах, акрамя фельчараў, выязджаюць урачы і мультыдысцыплінарныя брыгады. Напрыклад, падчас уборачнай кампаніі было арганізавана больш за 300 выездаў для агляду работнікаў сельскагаспадарчай сферы.

Для рашэння задачы, пастаўленай Прэзідэнтам, па аказанні якаснай медыцынскай дапамогі ўсім грамадзянам, і былі створаны міжраённыя цэнтры. Стварэнне такіх цэнтраў і функцыянаванне рознаўзроўневай сістэмы аказання дапамогі даюць магчымасць накіраваць пацыента на той узровень, дзе ён атрымае максімальна якасную дапамогу. Гэта забяспечвае даступнасць і аднолькавыя магчымасці для атрымання медыцынскай дапамогі як сельскаму, так і гарадскому насельніцтву.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**

КАЛЕГІЯ

# УЗМАЦНІЦЦА ВА ЎСІХ НАПРАМКАХ

## У Мінсельгасхарчы падвялі вынікі работы і вызначылі задачы для АПК



У пашыранай калегіі Міністэрства, якая прайшла з удзелам намесніка прэм'ер-міністра Юрыя ШУЛЕЙКІ, прынялі ўдзел кіраўнікі структурных падраздзяленняў міністэрства, дырэктары профільных арганізацый, а таксама старшыні камітэтаў па сельскай гаспадарцы і харчаванні ўсіх абласцей краіны.



**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ** нагадаў, што верасень — гэта вынік бягучага года і адначасова пачатак наступнага. «Тут вырашаецца ўсё: колькі мы захаваем, як падрыхтуем глебу, як забяспечым пасяўную. Працаваць трэба з максімальнай эфектыўнасцю, не расслабляцца ні на хвіліну», — адзначыў Юрый Горлаў.



**Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Наталля ШАЎЦОВА** адзначыла, што за восем месяцаў гэтага года сельскагаспадарчыя арганізацыі і сялянскія (фермерскія) гаспадаркі забяспечылі вытворчасць валавай прадукцыі на ўзроўні 102,3 % да аналагічнага перыяду 2024-га, пры гэтым раслінаводства — 102,7 %, жывёлагадоўлі — 102,1 %. «Гэта сведчыць аб сістэмнай рабоце, але не дае права на самазаспакаенне. Задачы да канца года застаюцца амбіцыйнымі і патрабуюць мабілізацыі ўсіх рэсурсаў», — дадала намеснік міністра.

У перапрацоўчай прамысловасці прааналізавалі паказчыкі за паўгоддзе. Індэкс фізічнага аб'ёму вытворчасці склаў 103,2 % пры планавым заданні 101,8 %. З задачай справіліся ўсе рэгіёны. Таксама адзначаецца рост вытворчасці ва ўсіх асноўных перапрацоўчых галінах: у вытворчасці малочных прадуктаў — 105,9 %, мяса і мясапрадуктаў — 102,5 %, мукамольна-крупяных прадуктаў — 102,5 %, хлебабулачных, макаронных і мучных кандытарскіх вырабаў — 104,9 %.

Рэнтабельнасць у прамысловасці за I паўгоддзе дасягнула 9 %, што вышэй за ўстаноўлены парог 6,3 %. З заданнем справіліся ўсе рэгіёны краіны.

Развіццё ўнутранага рынку суправаджаецца і актыўнымі пастаўкамі на экспарт: за студзень-чэрвень тэмп росту экспарту прадуктаў харчавання і сельгассыравіны склаў 112,9 % да ўзроўню мінулага года пры заданні 104 %, за сем месяцаў — 113,7 %.

Экспартныя пастаўкі ажыццяўляліся ў 104 краіны, асвоены новыя знешнія рынкі. Адзначаны рост экспарту ў краіны далёкага замежжа на 14,3 % за шэсць месяцаў. У той жа час на калегіі звярнулі ўвагу, што задачы па павелічэнні экспарту перад галіной стаяць сур'ёзныя, узмацніць работу ў гэтым напрамку трэба ўсім.

Таксама ў ліку задач — навядзенне парадку на сельскагаспадарчых аб'ектах, нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці свініны за кошт камплектавання і запуску магутнасцей у комплексах, забеспячэнне назапашвання мінеральных угнаенняў пад яравую сяўбу 2026 года, строгае выкананне тэрмінаў і тэхналогіі сяўбы азімых культур і закладкі пладовых садоў, дакладныя алгарытмы дзеянняў пры ўборцы гародніны.

Нягледзячы на станоўчую дынаміку падкрэслена неабходнасць далейшага ўзмацнення дысцыпліны і адказнасці на ўсіх узроўнях. «У аснове ўсяго — дакладна выбудаваная работа на месцах, вертыкаль кіравання і персанальная адказнасць за вынік, — адзначыў Юрый Шулейка. — Вольнасцяў у інтэрпрэтацыі тэхналагічных рэгламентаў быць не павінна. У нас няма права на памылку, асабліва цяпер, калі закладваем ураджай будучага года. Неабходна ўзмацніцца ва ўсіх напрамках».

Па выніках калегіі ўсім абласным камітэтам і арганізацыям Мінсельгасхарча дадзены даручэнні па аператыўным рэагаванні на любыя сітуацыі, недапушчэнні страт і дасягненні ўсіх ключавых паказчыкаў да канца года. Асаблівая ўвага — захаванасці жывёлы, тэхналагічнай дысцыпліне ў жывёлагадоўлі і якаснай падрыхтоўцы да пасяўной кампаніі 2026 года.

**Па матэрыялах БелТА.**




# СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ І ПРАЦАВІТАСЦЬ

## Паглядзелі, як у Зэльвенскім раёне Гродзенскай вобласці ўбіраюць бульбу



По ўсёй краіне падводзяць вынікі ў сельскагаспадарчай сферы, рэгіёны святкуюць «Дажынкі», але пакуль расслабляцца рана. Працягваюцца нарыхтоўка кармоў і сяўба, ідзе ўборка агародніны. Нягледзячы на нестабільнае надвор'е, аграпрамысловы комплекс не пацярпеў моцных страт, а недзе і нарасціў паказчыкі ў параўнанні з мінулым годам. Так атрымалася ў Зэльвенскім раёне. Уласны карэспандэнт «Звязды» даведалася, з якімі вынікамі падышоў раён да восені, а таксама пабывала на ўборцы бульбы.

### ПАВЫСІЛІ ПАКАЗЧЫКІ

Зэльвенскі раён сустрэў сардэчна, парадаваў прыгажосцю і дагледжанасцю. Экскурсію па сельскагаспадарчых угоддзях правёў **першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Сяргей СЫСКО**. Ён адзначыў, што асабліва радуе вынік па ўборцы збожжавых. Без уліку кукурузы трэба было ўбраць амаль 16 тысяч га, валавы збор склаў больш за 91 тысячу тон, сярэдняя ўраджайнасць у рэгіёне — 57,1 цэнтнера з гектара. Валавы збор збожжавых аказаўся вышэйшы, чым летась, на 10 тысяч тон. Яравыя збожжавыя паказалі сябе асабліва добра.

— Пачалася ўборка кукурузы на сілас і зерне. З-за ўмоў надвор'я ўсе работы стартавалі пазней, чым звычайна, але гаспадаркі актыўна ўключыліся ў працэс. Пад кукурузу аддадзена каля 6 тысяч гектараў зямлі. Таксама прыступілі да ўборкі цукровых буракоў. На гэты момант убрана 32 % плошчаў, накапана 27 138 тон. Адзінае, па чым не дацягнулі, — рапс. Ён мацней за ўсё пацярпеў ад замаразкаў, і ў параўнанні з мінулым годам не дабралі каля 5 тысяч тон ураджаю.

### БУЛЬБА ВЫДАТНАЯ!

Асаблівая ўвага — уборцы бульбы. Найбольш буйныя плошчы пад гэту культуру аддадзены ў КСУП «Галынка» — 55 гектараў, КСУП «Барадзічы» — 45, і ФГ «Даліна смаку» — 110 гектараў. Уборка ідзе добрымі тэмпамі, бульба выкапана на плошчы 77 гектараў.

Адправіліся на палі КСУП «Галынка», каб убачыць, як ідзе праца. Тут удзяляюць асаблівую ўвагу прымяненню сучасных тэхналогій у сельскай гаспадарцы. Вырошчваюць бульбу замежных і айчынных сартоў — «Каралева Ганна», «Гала», «Скарб» і новы сорт «Вектар».

Як расказаў **дырэктар гаспадаркі Яўген ГРЭЦКІ**, строга выконваецца тэхналогія вырошчвання. Вясной уносяцца арганічныя і фосфарна-калійныя ўгнаенні. Ранняй вясной наразаюцца разоры для выгравання глебы, а пасля дасягнення аптымальнай тэмпературы садзяць бульбу. Перад гэтым насенне апрацоўваецца, дадаецца комплекс мікраэлементаў і ўносіцца азотнае ўгнаенне.

— Падчас вегетацыі праводзяцца чатыры апрацоўкі для абароны ад хвароб з выкарыстаннем прэпаратаў і сістэмных кантактных сродкаў. Перад змыканнем бацвіння праводзіцца падкорм азотнымі ўгнаеннямі, — дзеліцца сакрэтамі поспеху кіраўнік гаспадаркі. — Калі строга прытрымлівацца тэхналогіі і нічога не ўпускаць, увосень атрымліваем на выхадзе добры ўраджай, які без праблем захоўваецца.

Капаюць бульбу камбайнамі. Адзін убірае да 2 гектараў за дзень, што значна хутчэй, чым пры ручной уборцы. Ад яе на Зэльвеншчыне адмовіліся ўжо даўно. Але, вядома, без зоркага чалавечага вока ніяк нельга. На камбайне працуюць 4 чалавекі, якія сартуюць бульбу, убіраюць камяні. А за рулём **механізатар Сяргей КАЧУК**, ён мясцовы, родам з Зэльвенскага раёна. У гаспадарцы працуе з 1998 года, за гэты час яна не раз мяняла назву, але адно заставалася нязменным — адказнае і трапяткое стаўленне да прафесіі.

— На бульбаўборачным камбайне працую ўжо 13-ы сезон. Колькі сябе памятаю, мне заўсёды падабалася тэхніка. Бацька шафёрам працаваў, але вось мне больш трактар падабаўся. Не магу сказаць, што ў працы нешта па-асабліваму падабаецца. Да ўсяго ляжыць душа. У іншай сферы я сябе ніколі не бачыў, ды і ўмовы працы выдатныя, можна спакойна рабіць, — падзяліўся Сяргей Качук.

### ДРОНЫ ДЛЯ СВОЕЧАСОВАЙ АПРАЦОЎКІ ПАЛЁЎ

Пасля ўборкі бульба адразу паступае ў сховішча з пастаяннай тэмпературай +5 градусаў. Выкарыстоўваецца сістэма актыўнага вентылявання для забеспячэння аптымальных умоў захоўвання. Акрамя вырошчвання бульбы, гаспадарка займаецца апрацоўкай іншых культур — цукровых буракоў, збожжавых. Асаблівая ўвага — падрыхтоўцы палёў увосень, унясенню арганікі. Падчас вегетацыі праводзяцца сучасныя падкормкі, хімпраполка і апрацоўкі ад хвароб і шкоднікаў.

— Мы выкарыстоўваем дроны для своечасовай апрацоўкі палёў. Гэтыя прылады дапамагаюць сачыць за станам пасеваў і ўносіць угнаенні, напрыклад, пры апрацоўцы азімага рапсу. Да гэтай тэхналогіі звяртаемся, калі ўмовы надвор'я перашкодзілі ўкласціся ў графік. Дроны дапамагаюць усё зрабіць своечасова. Ужыванне сучасных тэхналогій і строгае выкананне тэхналогій апрацоўкі дазваляюць атрымліваць добрыя ўраджаі і забяспечваць высокую якасць прадукцыі, — патлумачыў кіраўнік сельгаспрадпрыемства.

Сельгасработы ў Зэльвенскім раёне працягваюцца, і наперадзе яшчэ шмат задач. Але ўжо цяпер можна сказаць, што раён падыходзіць да фінішу палявых работ з добрымі вынікамі і перспектывамі для далейшага развіцця.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

*Зэльвенскі раён.*

ПЫТАННЕ — АДКАЗ



# ЦІ БУДЗЕ РЭГІСТРАЦЫЯ?



**Міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ адказаў на пытанне ў праекце #наПадумаць**

— У Расіі са жніўня 2024 года ў Законе аб інфармацыі з'явілася норма, якая абавязвае карыстальнікаў, якія маюць у сацсетках аўдыторыю больш за 10 тысяч падпісчыкаў, рэгістравацца ў Раскамнаглядзе. Ці чакае такі абавязак беларускіх блогераў? І ці будзе гэта Мініфарм?

Адказ міністра:

— Давайце адкажу проста, без юрыдычных вынаходстваў. У Расіі павінны рэгістравацца не толькі блогеры — фізасобы, але і ІП, і кампаніі, у якіх на любой платформе ёсць звыш 10 тысяч падпісчыкаў. Больш за тое, Раскамнагляд можа запатрабаваць абмежаваць доступ да старонкі блогера, які не прайшоў рэгістрацыю. І адначасова забараніць рэпост інфармацыі з незарэгістраваных старонак для звычайных карыстальнікаў.

У Беларусі такой прамой нормы сёння няма. Ёсць нормы ў заканадаўстве аб рэкламе, якія прадугледжваюць, што ІП і юрыдычныя асобы, якія размяшчаюць рэкламу на сваіх рэсурсах, абавязаны зарэгістравацца ў спецыяльным рэестры рэкламараспаўсюджвальнікаў, які вядзе МАРГ. Інакш можа ўзнікнуць адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу. Іншых абмежаванняў, падобных расійскім, у нас няма.

Простымі словамі, нават калі ў цябе пара падпісчыкаў, але ты рэкламуеш нешта, — будзь ласкавы, — у рэестр. І ў той жа час, калі ў цябе 100 тысяч падпісчыкаў, але рэкламы на пляцоўцы няма, — абавязку рэгістравацца ў МАРГу ў цябе таксама няма. Ці лагічна гэта — не думаю. Як зрабіць лагічней — трэба думаць разам з зацікаўленымі, у тым ліку і блогерамі.

АКЦЭНТЫ

# У ЦЭНТРВЫБАРКАМЕ ПАЧАЛІ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НОВАГА ЭЛЕКТАРАЛЬНАГА ПЕРЫЯДУ

## Сярод прыярытэтаў — работа з насельніцтвам і моладдзю па павышэнні прававой культуры

У Мінску прайшло пасяджэнне Цэнтрвыбаркама, на якім былі абмеркаваны пытанні работы ў міжэлектаральны перыяд, у прыватнасці, аналіз папярэдніх выбарчых кампаній, вывучэнне і абагульненне паведамленняў з месцаў па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства і выбарчай сістэмы, а таксама функцыянаванне і падрыхтоўка выбарчай сістэмы да новага электаральнага перыяду 2029-2030 года.

У верасні завяршаецца беларускае старшынства ў Кансультатыўным савеце кіраўнікоў выбарчых органаў краін СНД. **Старшыня ЦВК Ігар КАРПЕНКА** падвёў яго вынікі, назваўшы прыярытэтнымі кірункамі работы забеспячэнне электаральнага суверэнітэту краін-удзельніц, пытанні прававой асветы грамадзян і моладзі ў галіне выбарчага права і тэхналогій, а таксама навучанне арганізатараў выбараў.



— Найперш мы падзяліліся найлепшымі методыкамі навучання патэнцыяльных арганізатараў выбараў. На базе Акадэміі кіравання і пры яе актыўным удзеле падрыхтавалі вучэбна-метадычны комплекс і выпусцілі вучэбна-метадычны дапаможнік — адзіны пакуль на нашай прасторы. Акрамя таго, сфарміравалі рабочую групу, якая будзе працаваць у галіне маладзёжнай палітыкі ў электаральнай сферы, і ўключылі ў яе склад двух нашых прадстаўнікоў. Першае яе пасяджэнне ў анлайн-фармаце пройдзе ў рамках пасяджэння Кансультатыўнага савета ў Казахстане ў кастрычніку гэтага года, — расказаў Ігар Карпенка.

Важным завяршальным этапам старшынства стане II Міжнародны электаральны форум, які прыме Мінск 8-9 кастрычніка. Запланавана навукова-практычная канферэнцыя, якая будзе праводзіцца ўжо ў трэці раз. Акрамя гэтага, пройдзе пасяджэнне маладзёжнага круглага стала. Абдудзецца дыялогавая пляцоўка з удзеламі кіраўніцтва ЦВК і Міністэрства адукацыі, пройдзе таксама панэльная дыскусія «Духоўна-маральныя асновы фарміравання прававой культуры падрастаючага пакалення».

Ігар Карпенка нагадаў, што ў рамках беларускага старшынства былі праведзены два пасяджэнні кансультатыўнага савета, прынята сумесная заява, ініцыяваная ЦВК Расіі. Дакумент накіраваны на ўзаемадзеянне абедзвюх краін у галіне электаральнай палітыкі, дзе заяўлена аб недапушчальнасці знешняга ўмяшальніцтва ў электаральныя працэсы.

Беларускі электаральны вопыт цікавы на прасторы СНД яшчэ і тым, што наша краіна адной з першых замацавала паняцце электаральнага суверэнітэту ў канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Акрамя таго, у Беларусі падыходы, якія забяспечваюць электаральны суверэнітэт нашай краіны, замацаваны заканадаўча.

Што датычыцца навучання моладзі прававой культуры, Ігар Карпенка падкрэсліў, што традыцыйнай у нашай краіне стала алімпіяда школьнікаў у галіне выбарчага права. ЦВК падтрымлівае ініцыятыву навучальных устаноў па стварэнні клуба маладых выбаршчыкаў, а таксама правядзенне розных дыялогавых пляцовак. Цікавы ў гэтым плане вопыт Мінска, дзе ў фармаце «адкрытае веданне» праводзяцца сустрэчы з людзьмі, якія займаюцца правядзеннем выбарчага працэсу, са старшынямі тэрытарыяльных, рэгіянальных выбарчых камісій і арганізатарамі выбараў.

**Алена КРАВЕЦ.**

МЕДЫЯПРАСТОРА

# «БЛОГБАЙ» У ПАЛЯВЫХ УМОВАХ

## Як прайшоў другі дзень Форуму беларускіх блогераў

Другі дзень II Форуму беларускіх блогераў «БлогБай. Сіла ў праўдзе!» стаў сапраўднай кульмінацыяй мерапрыемства. Усіх удзельнікаў чакала поўнае пагружэнне ў атмасферу ваеннага жыцця — ад начлегу ў казармах да стральбы з гранатамёта. Але пра ўсё па парадку.

Праграма другога дня форуму была выразна падзелена на тэарэтычны і практычны блокі. Раніцай удзельнікаў чакала сесія па абмене досведам з медыяэкспертамі. Вядучыя рэдактары СМІ правялі для блогераў лікбез па самых актуальных тэмах: ад сакрэтаў аўтарскага стылю і стварэння кантэнту да тонкасцяў працы з прэс-службамі.

Пасля мазгавога штурму — перамяшчэнне ў палявы лагер «Белая Лужа» і пераход да самай відовішчнай часткі! Адразу пасля абеду ўдзельнікі пачалі агнявую падрыхтоўку, асвойваючы стральбу са стралковай зброі. Дарэчы, гэты форум стаў унікальнай магчымасцю пастраляць практычна з кожнага віду стралковай зброі, якая выкарыстоўваецца ў сучаснай беларускай арміі: ад аўтамата Калашнікава і пісталета Макарава да кулямёта Калашнікава і ручнога супрацьтанкавага гранатамёта.

Сваімі эмоцыямі падзялілася блогер Альбіна Баранава.

— Шчыра сказаць, калі ты толькі падыходзіш, яшчэ не страшна. Мы ішлі па парах: спачатку страляў калега, потым я. Насамрэч, я вельмі спалохалася, але мне дапамаглі, і ўсё гэта адбывалася вельмі хутка. І, шчыра кажучы, гэта вельмі крута, — адзначыла яна.

Альбіна прымае ўдзел у форуме ўжо другі раз. Дзяўчына расказала, што захацела ўдзельнічаць у мерапрыемстве адразу пасля таго, як убачыла анонс.

— Прачытала: «Ці гатовыя вы да палявых умоў?» І, шчыра кажучы, насцярожылася, але зразумела, што нешта новае спрабаваць трэба. Вось і атрымалася. Я прайшла, да маёй вялікай радасці, і апынулася тут, — расказала яна. — Самы галоўны плюс форуму — дружнае кам'юніці блогераў. Вельмі шмат тых, хто быў тут летась. Я бачу ўжо знаёмыя твары, і мы здымаем калабарацыі. Падымаем ахоп і расказваем пра сапраўды важныя і патрэбныя рэчы ў нашай краіне.

Дзяўчына вядзе блог, дзе расказвае пра мерапрыемствы ў краіне, а таксама падрыхтоўку да іх. Альбіна Баранава падкрэсліла, што форум не дарма носіць назву «Сіла ў праўдзе».

— Сёння ў нашай інтэрнэт-прасторы пачало з'яўляцца вельмі шмат фэйкавай інфармацыі. Таму мне здаецца, што мы, як блогеры Рэспублікі Беларусь, павінны як мага больш асвятляць праўду і даносіць яе да нашага народа, — сказала яна.

Увечары ўсіх удзельнікаў мерапрыемства чакалі атмасферныя вячоркі каля вогнішча і палявая лазня. А ўвогуле пасля ўсіх перажытых выпрабаванняў можна з упэўненасцю сказаць, што другі дзень форуму стаў магутным акцэнтам на яго асноўнай ідэі. Спалучэнне інтэлектуальнай працы ў галіне медыя і суровых вайсковых выпрабаванняў з'ядналі ўдзельнікаў у сапраўдную супольнасць. Атрыманыя веды, унікальны вопыт і, галоўнае, усведамленне сваёй ролі ў супрацьдзеянні фэйкам далі блогерам тую самую сілу — сілу ў праўдзе, якую яны цяпер будуць несці сваім чытачам і падпісчыкам.

**Лізавета ГОЛАД.**





Фота БелТА.

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ЧАЛАВЕК

## Мінэканомікі: кожная карэкціроўка дзяржпраграмы — крок да больш высокіх вынікаў

25-26 верасня пастаянная міжведамасная камісія па дзяржаўных праграмах пад старшынством намесніка міністра эканомікі Марыі МАЖЫНСКАЙ разглядала магчымасць карэкціроўкі шэрагу дзеючых дзяржпраграм, а таксама праекты дакументаў новай пяцігодкі, паведамілі ў эканамічным ведамстве.

На думку намесніка кіраўніка міністэрства, аператыўнасць і зручнасць узаемадзеяння паміж дзяржавай, бізнесам і насельніцтвам — падмурак сучаснай эканомікі, арыентаванай на ўпэўнены рост.

— У цэнтры ўвагі — чалавек, яго праца, яго дабрабыт. Правана годны заробак павінна быць гарантавана ў кожным кутку краіны. Камісія гатовая ўхваліць змены, якія дадуць канкрэтны вынік у выглядзе новых працоўных месцаў у малых раёнах, сельскай мясцовасці, паляпшэнне ўмоў працы, пашырэнне занятасці моладзі, адраснай дапамогі грамадзянам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, і гэтак далей, — адзначыла Марыя Мажынская.

Асаблівая ўвага была ўдзелена новым праграмам пяцігадовага цыкла — «Развіццё дэмаграфічнага патэнцыялу» і «Беларусь гасцінная».

Дэмаграфічная стратэгія накіравана на падтрымку сям'яў пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, а таксама на ўмацаванне духоўна-маральных каштоўнасцяў шлюбу і мацярынства. Мэта — перафарматаваць бягучыя трэнды, змяніць грамадскія ўстаноўкі, вярнуўшы павагу да сям'і як да апоры дзяржавы.



У сваю чаргу, праграма «Беларусь гасцінная» ставіць перад сабой амбіцыйныя задачы: развіццё ўязнога і ўнутранага турызму, лічбавізацыя галіны, фарміраванне вядомага нацыянальнага турыстычнага брэнда, заснаванага на багацці і самабытнасці беларускай культуры.

# ЭФЕКТЫЎНЫ МЕХАНІЗМ

## Працэдура санацыі дапамагла захаваць устойлівасць і павысіць эфектыўнасць працы Гомельскага тлушчавага камбіната

Начальнік Гомельскага абласнога тэрытарыяльнага аддзела па санацыі і банкруцтве Аляксандр ГАРБУН узяў удзел у пасяджэнні эканамічнага суда Гомельскай вобласці па разглядзе вынікаў дзейнасці ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат», расказалі ў прэс-службе Мінэканомікі.



Тут нагадалі, што прадпрыемства знаходзіцца ў санацыі з сакавіка 2019 года. Дзякуючы выкарыстанню інструментаў фінансавага аздараўлення, прадугледжаных заканадаўствам аб урэгуляванні неплацежаздольнасці, ужо больш за пяць гадоў арганізацыя працуе стабільна: захаваны працоўныя месцы для 383 чалавек, забяспечана своечасовая выплата заработнай платы, падаткаў і бягучых плацяжоў.

Кампанія бачыць перспектывы свайго далейшага развіцця: наладжана пастаянная пастаўка прадукцыі ў Кітай і іншыя краіны далёкага і блізкага замежжа, актыўна асвойваюцца новыя рынкі збыту.

— Такія вынікі нагляднa пацвярджаюць дзейснасць механізмаў абароны прадпрыемстваў ад неплацежаздольнасці і важнасць іх своечасовага прымянення, — адзначыў Аляксандр Гарбун.

# АКЦЭНТ НА РАЗВІЦЦЁ

## У «Вялікім камені» ідзе актыўнае будаўніцтва кантэйнернага тэрмінала і інжынернай інфраструктуры

У Індустрыяльным парку «Вялікі камень» хуткімі тэмпамі працягваецца рэалізацыя маштабных інфраструктурных праектаў, якія фарміруюць аснову для далейшага развіцця парка як міжнароднага лагістычнага і прамысловага хаба.




Як паведамілі ў адміністрацыі парка, цяпер вядзецца ўстаноўка чыгуначнага палатна на аб'екце «Бімадальны кантэйнерны тэрмінал GREATPORT». Завяршэнне будаўніцтва тэрмінала запланавана на другую палову 2026 года.

Тэрмінал стане сучасным «сухім портам» на маршруце ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і забяспечыць перапрацоўку да 180 тысяч кантэйнераў у год з магчымасцю павелічэння магутнасці да 500 тысяч ДФЭ. Праект прадугледжвае чатыры чыгуначныя шляхі па 1050 метраў, кантэйнерныя пляцоўкі ёмістасцю да 6000 FEU, складскія памяшканні, сэрвісныя зоны для рамонту і мыйкі кантэйнераў, а таксама сучасную сістэму аптычнага распазнання і лічбавае кіраванне усімі працэсамі. Рэалізацыя праекта стане важным крокам для ўмацавання транспартна-лагістычнага патэнцыялу парка і яго інтэграцыі ў міжнародныя грузавыя ланцужкі.

Паралельна пачаты работы па аб'екце «інжынерна-транспартная інфраструктура тэрыторыі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Цэнтральная частка. Першая чарга». У рамках праекта працягваюцца будаўніцтва Пекінскага праспекта і стварэнне інжынерных сетак.

Новая інфраструктура забяспечыць кантэйнерны тэрмінал і будучых рэзідэнтаў цэнтральнай часткі парка ўсёй неабходнай інжынернай падтрымкай для стабільнага функцыянавання і развіцця вытворчасцяў.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов

• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1. УНП 400068171 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**
Транспортные средства и спецтехника (б/у), расположенная по адресу: г. Гомель, ул. Братьев Лизюковых, 1

| № п/п | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 4241 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300W0, рег. знак А3222 А-3, 2008 г. в. | 27 300,00 |
| 2 | 4248 | Прицеп-фургон изотермический MAZ 837810 1012 «Купава 871100», рег. знак А 3238 А-3, 2008 г. в. | 22 646,20 |
| 3 | 4246 | Прицеп специальный фургон изотермический MAZ 837810 KUPAVA 871100, рег. знак А 3237 А-3, 2008 г. в. | 13 261,37 |
| 4 | 4278 | Прицеп специальный фургон изотермический MAZ 837810 KUPAVA 871100, рег. знак А 3520 А-3, 2008 г. в. | 9 542,16 |
| 5 | 4914 | Автомобиль грузовой фургон-рефрижератор МАЗ 6303 А5 «Купава 673100», рег. знак АЕ 9299-3, 2011 г. в. | 28 274,26 |
| 6 | 806 | Легковой седан (SEDAN) MITSUBISHI LANCER, рег номер 3974 ВЕ-3, 2007 г. в. | 4 740,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену лота на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 8–10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение трех дней со дня проведения торгов (Сумма затрат и процент вознаграждения указан в карточке лота предмета электронных торгов на ЭТП «ИПМ-Торги»)

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 09.10.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества в связи с неоплатой жилищно-коммунальных услуг.

**Электронные торги состоятся 10.10.2025 в 10.00**

**Лот № 1:** 19/100 долей в праве собственности на изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-156653 (наименование – квартира, общая пл. – 92,6 кв. м), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пуховичская, д. 13, кв. 15.
Начальная цена без учета НДС – 40 850,00 руб.
Задаток – 4 085,00 руб.

**Лот № 2:** 7/50 долей в праве собственности на изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-153458 (наименование – квартира № 17, общая пл. – 102,9 кв. м), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пуховичская, д. 5, кв. 17.
Начальная цена без учета НДС – 33 155,00 руб.
Задаток – 3 315,50 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Продавец – Администрация Октябрьского района г. Минска.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **08.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидский завод электроизделий», Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, д. 4. УНП 500021270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Лот № 1** | |
| **Склад** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, **1037,6 кв. м,** 420/С-100675) **и сооружение благоустройства** (сооружение неустановлен. назначения, **1147,0 кв. м,** 420/С-102173), **зеленые насаждения** (рябина 1 шт., липа 2 шт., яблоня 1 шт., шиповник, дерен белый, живая изгородь 20 п. м, газон обыкновенный № 92, № 94, № 96 311,5 кв. м). **Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/7, 14Ж/13** | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 297 179,82 бел. руб.** | |
| **Лот № 2** | |
| **Склад** (складское помещение, **1001,7 кв. м,** 420/D-80022), **сооружение благоустройства** (сооружение неустановлен. назначения, **487,0 кв. м,** 420/С-102180), **газон обыкновенный № 95** 229,0 кв. м). **Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/ 4- 3, 14Ж/17** | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 284 051,56 бел. руб.** | |
| Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| ***Сведения о земельном участке, на котором расположены лоты***: пл. **3,6915 га** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 991/1250, срок действия по 21.06.2071) для строительства и обслуживания производ. площадки № 2. **После продажи лота Продавец уполномочивает Покупателя обратиться за определением доли (с установлением сервитута при необходимости) в праве на зем. участок, необходимой для обслуживания кап. строений в установленном законодательством порядке. Расходы по оформлению прав на зем. участок, госуд. регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет аукциона и иных необходимых действий в соответствии с законодательством несет Покупатель** | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней** после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных** дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 4 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 28.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов
и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by,
местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **государственного предприятия «Минский областной технопарк»**
(продавец, местонахождение: Смолевичский район, д. Станок Водица, ул. Заводская, 1)
проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1. Ленточнопильный станок Pegas 360*500 GH-LR,**
**2011 г. в., серийный № 3600221001, инв. № по бух. учету 631.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 18 576,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **1 857,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Универсальный фрезерный станок «ОРША-Ф32 У.31»,**
**2009 г. в., заводской № 72, инв. № по бух. учету 311.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 45 168,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **4 516,00 бел. руб.**
**Стоимость лотов снижена на 60 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.04.2025, 21.05.2025, 13.06.2025, 10.07.2025, 06.08.2025, 29.08.2025.*

Электронные торги состоятся **14.10.2025** в **10.00** на torgi.rlt.by.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.10.2025** до **17.00.**

**Тел. организатора торгов: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 690-38-46.**

УНП 600017416





## ПАСПЯХОВАЯ РАБОТА ДЗЕЛЯ ТЭХНАЛАГІЧНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ КРАІНЫ

### З прафесійным святам машынабудаўнікоў павіншаваў Прэзідэнт Беларусі

У віншаванні адзначаецца, што машынабудаўнічая галіна з'яўляецца адной з найважнейшых для эканомікі краіны, дае рабочыя месцы дзясяткам тысяч жыхароў рэспублікі. А прадукцыя, якая сходзіць з айчынных канвеераў, запатрабавана ва ўсім свеце.

«Аснова такой паспяховай работы закладзена ветэранамі, а сённяшняя моладзь сваімі свежымі ідэямі дапамагае ўкараняць у вытворчасці самыя перадавыя і інавацыйныя тэхналогіі, — гаворыцца ў віншавальным адрасе. — Упэўнены, што і надалей, выкарыстоўваючы назапашаны вопыт і вынікі сучасных дасягненняў, работнікі Міністэрства прамысловасці, навуковых і канструктарскіх бюро, прадпрыемстваў галіны выканаюць адказныя задачы па забеспячэнні тэхналагічнага суверэнітэту, што яшчэ больш умацуе нашы пазіцыі на міжнародным рынку».

# ЭЛЕКТРАКАРЫ, МАШЫНЫ БЕЗ КІРОЎЦЫ І НА ВАДАРОДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У машынабудаванні трэба рабіць акцэнт на электрыфікацыі і рабатызацыі, лічыць генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі Сяргей ПАДДУБКА. Тут выконваецца поўны цыкл: ад дызайну, разлікаў і праектавання да выпрабаванняў і сертыфікацыі. Усе гэтыя кірункі запатрабаваныя, развіваюцца, а галоўныя трэнды галіны — электрыфікацыя, беспілотныя комплексы і рабатызацыя.





## ДЗЕ СТВАРАЮЦЦА «ЛІЧБАВЫЯ ДВАЙНІКІ»?

Генеральны дырэктар патлумачыў, чаму сёння робіцца стаўка на электракары: «Электрапрывад — высокаэфектыўны, яго ККД вышэйшы ў разы, чым звычайныя цеплавыя ўстаноўкі. Другое — аўтаматызацыя працэсаў, у тым ліку бяспека вадзіцеляў і пешаходаў, таму што ёсць электронныя сродкі дапамогі, якія дапамагаюць кіраваць транспартам, і беспілотнасць як далейшае развіццё гэтай сістэмы».

Сяргей Паддубка заявіў, што партнёры інстытута — практычна ўсе буйныя прадпрыемствы машынабудаўнічага комплексу: БЕЛАЗ, МАЗ, МТЗ, «Белкамунмаш» і іншыя. З кожным з іх маецца сумесны праект і жаданне дапамагаць ствараць новую, сучасную тэхніку. «Сёлета сумесна з BELGEE з канвеера выпусцілі пяць легкавых электрамабіляў і правodзілі выпрабаванні, а таксама працягнулі выпрабоўваць новыя тыпы электрапрывадаў, даводзім да дасканаласці грузавыя электрамабілі і займаемся выпрабаваннем беспілотных самазвалаў «БЕЛАЗ».

**Намеснік генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута машынабудавання па навуковай рабоце Аляксей ШМЯЛЁЎ** паказаў нам Рэспубліканскі камп'ютарны цэнтр машынабудаўнічага профілю. У аддзеле прамысловага дызайну ствараюцца самыя стыльныя аўтамабілі. У аддзеле мадэлявання і віртуальных выпрабаванняў можна назіраць, як ствараюцца «лічбавыя двайнікі». Паміж фізічным аб'ектам і віртуальнай мадэллю існуе двухбаковы канал абмену данымі. Дзякуючы гэтаму ёсць магчымасць, напрыклад, загадзя даведацца, калі менавіта аўтамабілю трэба прайсці дыягностыку і замяніць запчасткі, каб пазбегнуць паломкі.






Малая камунальная машына — не ноу-хау, многія краіны маюць свае распрацоўкі. Аднак мадэль з інстытута пераўзыходзіць іншыя тым, што тут выканалі абсалютна ўсе міжнародныя параметры: агляднасць, камфорт, функцыянальнасць, бяспека і гэтак далей. Па прызначэнні машына змятае і прыбірае смецце, праводзіць хуткасную ачыстку тратуараў і дарог ад снегу і шмат чаго яшчэ.

## СВАЯ «ЭЛЕКТРЫЧКА»

Заўважаем доледны ўзор электрамабіля BELGEE eX50, створаны ў інстытуце. Ён стыльны і сучасны. Распрацоўшчыкі не сумняваюцца, што пасля запуску ў серыйную вытворчасць такія аўто абавязкова знойдуць новых уладальнікаў. Мы ўбачылі электрамабіль для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, створаны на базе FAW Bestune Xiaoma. Ён абсталяваны ручным кіраваннем, а побач з кіроўцам замест пасажырскага крэсла — месца для інваліднай каляскі.

**Намеснік генеральнага дырэктара па высокааўтаматызаваным электратранспарце Аляксандр БЯЛЕВІЧ** адзначае, што вопыт стварэння айчыннага электрамабіля дае разуменне таго, як і дзе шукаць яго кампанентную базу на прадпрыемствах краіны. Напрыклад, электрабатарэі бяруцца на першай акумулятарнай кампаніі, рухавік — на магілёўскім заводзе электрарухавікоў, электроніка — на заводзе «Вымяральнік». Не заўсёды тое, што прыдумаюць навукоўцы, можна ўвасобіць у жыццё. Даводзіцца падладжвацца пад канкрэтнага вытворцу.



Унікальнасць нашага электракара ў тым, што такога ўзроўню лакалізацыі «электрычкі» больш няма ні ў каго на тэрыторыі ўсяго СНД. Напрыклад, электрапрывад у нашай машыны чыста беларускага вырабу. «У электроніцы выкарыстоўваюцца, у тым ліку, і замежныя мікрасхемы, але мы ведаем, дзе іх можна лёгка набыць або на якую дэталь замяніць», — тлумачыць Аляксандр Бялевіч.

Сёння ў беларускіх распрацоўшчыкаў дастаткова аб'ёмная кампетэнцыя па пошуку ўсіх вузлоў і дэталяў (высокай якасці) легкавай электрамашыны. Вядзецца пошук іх аналагаў, якія могуць выраблць нашы заводы.

## У КАР'ЕР — БЕЗ КІРОЎЦЫ

Як паведаміў Аляксандр Бялевіч карэспандэнту «Звязды», вельмі вялікая ўвага сёння аддаецца беспілотнаму транспарту як новаму тэхналагічнаму кірунку. Таму ў нашай краіне цяпер напрацоўваюцца кампетэнцыі ў галіне тэхнічнага зроку, у галіне інфраструктуры, якая забяспечвае работу транспарту на закрытых тэхналагічных пляцоўках. Сёння падобнае адбываецца на кар'еры па здабычы карысных выкапняў БЕЛАЗА. Тут арганізавана асобная пляцоўка, дзе адточваецца распрацоўка беспілотных тэхналогій. Налета плануецца гэтую беспілотную тэхналогію трансляваць на тэрыторыю Расіі ў рэальны кар'ер. Ужо цяпер ёсць зацікаўленыя кампаніі, якія купляюць такія беспілотныя самазвалы.

Другі кірунак выкарыстання беспілотнікаў датычыцца сельскай гаспадаркі. «Намі створаны эксперыментальны ўзор аўтаномнага трактара на базе «Беларус-3523» з электрычнай трансмісіяй. Ён выконвае ўсе свае функцыі на «выдатна», але ёсць адзін нюанс. Такая машына больш чым удвая даражэйшая за звычайны трактар. Кошт абсталявання яго супастаўны з коштам яшчэ аднаго жалезнага «каня». А гэта для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў нявыгадна. Мы знайшлі выйсце. Тэхнічныя напрацоўкі беспілотнай тэхнікі з яго далейшай адладкай было вырашана ажыццявіць на больш дарагіх машынах, на кар'ернай тэхніцы. А потым ужо зафіксаваныя тэхнічныя ноу-хау выкарыстоўваць для стварэння больш таннай сельгастэхнікі», — адзначыў Аляксандр Бялевіч.

Акрамя таго, спецыяльна для Цэнтральнага батанічнага саду (які размясціўся побач з інстытутам) створаны экскурсійны міні-аўтобус. Пакуль гэты аўтамабіль пілатаваны, але прадугледжвае функцыі беспілотнага транспарту. Дакладней, ён будзе рухацца аўтаномна, але дзеянні машыны — пад кантролем кіроўцы. Гэта робіцца для таго, каб падчас узнікнення пазаштатнай сітуацыі на месцы быў спецыяліст, які выправіць магчымую памылку.

Актыўна распрацоўваецца прымяненне беспілотных тэхналогій пры будаўніцтве аднатыпных шматсекцыйных будынкаў. Сюды ўваходзяць падрыхтоўка будпляцоўкі пад узвядзенне аб'екта і аўтаматычная зборка самой канструкцыі будынка. Узаемадзеянне розных робатаў менавіта на будпляцоўцы актыўна распрацоўваецца беларускімі спецыялістамі. У канчатковым выніку праз 5—10 гадоў на будоўлі людзей не будзе наогул. Складаны канструктар збяруць выключна робаты.

Няўжо мы будзем у гэтай галіне першымі? Адказаць адназначна на гэтае пытанне складана. «Нешта падобнае ўжо распрацоўваецца. Сёння існуюць робаты, якія вырабляюць цагляны мур. Часткова аўтаматызуюцца схемы будаўніцтва на адна-, максімум на двухпавярховых будынках. Робатаў, якія ўзводзяць буйныя шматпавярховыя дамы, сёння нідзе няма», — заўважыў спецыяліст.

Больш аператыўнымі тэмпамі будзе развівацца складская лагістыка. Ужо досыць хутка буйныя памяшканні, якія прызначаны для захоўвання і выдачы тавараў, застануцца практычна бязлюднымі. Электракары, якія сёння перавозяць на складах грузы, будуць дзейнічаць у аўтаномным рэжыме. Такі «канструктар» збіраць і разбіраць будзе значна прасцей, чым узводзіць шматкватэрныя дамы.

## ПЕРСПЕКТЫЎНАЕ ПАЛІВА

У нашай краіне на першым этапе — стварэнне стэнда, дзе будзе рэалізавана ідэя выкарыстання вадароду. Наступны этап — зборка (ужо налета) рэальнага легкавога аўтамабіля на гэтым перспектыўным паліве. Трэба разумець, што вадарод з'яўляецца больш «канцэнтраваным» гаручым. Гэта нашмат большы запас ходу з максімальнай магутнасцю руху. Дарэчы, вялікая магутнасць цягі вадароду выкарыстоўваецца айчыннымі вытворцамі кар'ерных самазвалаў. Але гэта чыста камерцыйныя распрацоўкі.

«Калі зазірнуць у будучыню, то па гарадскіх вуліцах будуць рухацца электракары або машыны з гібрыднымі рухавікамі», — лічыць Аляксандр Бялевіч. Легкавыя аўтамашыны на вадародзе хутчэй за ўсё прызначаныя на больш працяглую паездку на вялікія адлегласці. Такія машыны будуць перавозіць грузы і людзей паміж буйнымі гарадамі, рэгіёнамі і рознымі краінамі. Унутры пэўнага кластара або хаба, больш выгадным і мэтазгодным будзе выкарыстанне электрычных батарэй.

Цяпер у патэнцыяльных спажыўцоў вадароднага паліва ёсць пэўныя асцярогі, напрыклад, па тэхналогіі запраўкі. Як аказалася, гэтая працэдура вельмі падобная з запраўкай машыны газам. Напрыклад, у Кітаі кліенты проста бяруць шланг і запраўляюць сваё аўто. Так, там прадугледжаны спецыяльны раз'ём, праз які пад вялікім ціскам запампоўваецца вадарод. Гэта нашмат хутчэй зарадкі акумулятарных батарэй, але «заліванне» вадародам не такое хуткае, як у вадкага паліва. Напрыклад, запраўка вялікага грузавога аўтамабіля вадародам адбываецца за 10—15 хвілін.

Па ўзроўні шуму вадародныя машыны падобныя на электракары, таму што там няма дадатковых механізмаў. Прысутнічае электрахімічны генератар, калі на хімічным узроўні з вадароду здабываецца электрычнасць. «У простага абывацеля ўзнікаюць пытанні, звязаныя з бяспекай такога транспарту. Але сучасныя тэхналогіі дазваляюць рабіць гэта на высокім узроўні абсалютна беспраблемна. Паступова такія тэхналогіі прыйдуць і да нас, і мы іх асвоім», — лічыць эксперт.

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего **ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»- управляющая компания холдинга»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 09.10.2025.**

**Лот № 1.** Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 без сменного рабочего оборудования на гусеничных лентах,
идентификационный № Y39ЭО32230610547, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 30 480,00 руб.
Задаток – 3 048,00 руб.

**Лот № 2.** Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 без сменного рабочего оборудования на гусеничных лентах,
идентификационный номер не определен, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 15 240,00 руб.
Задаток – 1 524,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–2:** Минская обл., Пуховичский район, п. Правдинский, ул. Зеленая, 53 А.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **07.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 10 октября 2025 г.**

**Лот № 1:**
**FORD TRANSIT VAN 460 EL VEGAS 209622,**
WF0XXXTTFXBK50453, Y39209622B0067023.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 22 387,00 бел. руб.
Задаток – 2 238,70 бел. руб.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Фабрициуса, 8в.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **08.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов по продаже права заключения договора аренды сроком на 1 год имущества, принадлежащего
**РУП «Белмедпрепараты»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 29.10.2025 в 10.00.**

**Лот № 1.** Часть помещения производственно-пускового комплекса площадью 2,46 кв. м с инв. № 401/D-13928.
Адрес: Гродненская обл., Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Кизевича, 50-4.
Начальная цена с НДС 20 % – 11,54 руб.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# РАДЗІМА — ГЭТА НЕ ПРОСТА КРАІНА

## Гісторыя чалавека, які нарадзіўся ў Расіі, але знайшоў дом у Беларусі

Спецыяліст кірунку ідэалагічнай работы і сацыяльнай абароны ваеннага камісарыята Гродзенскай вобласці Аляксандр КАВУН — выхадзец з ваеннай дынастыі, якую прадоўжыў і яго сын. Жыццёвы шлях майго суразмоўцы цікавы, поўны пераездаў. Нязменным заставалася толькі адно — бязмежная адданасць сваёй справе.

### «ДЗЯДУЛЯ — МОЙ ПРЫКЛАД»

Маленькі Саша заўсёды браў прыклад са свайго дзядулі. Ён быў моцны, негаваркі, але вельмі добры. Вялікая Айчынная вайна пакінула ў яго сэрцы раны, якія адгукаліся болем. Фёдар Дарахцееў нарадзіўся ва Украіне, да вайны служыў у Чырвонай арміі, атрымаў званне сяржанта і ваенную спецыяльнасць — начальніка радыёстанцыі. Ён прайшоў франтавымі дарогамі праз мноства баёў і бітваў, у пачатку вайны аказаўся ў палоне, але пасля вызвалення зноў вярнуўся на фронт. Служыў у 78-й гвардзейскай стралковай Вісленскай дывізіі і ўдзельнічаў у Берлінскай наступальнай аперацыі. Перамогу сустрэў у чэшскай сталіцы. За заслугі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За Адвагу» і «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».

«А мой бацька праслужыў у арміі 28 гадоў, маці — 15. Першай па слядах родных пайшла старэйшая сястра, яна стала ваенным медыкам, яе муж таксама ваеннаслужачы. Але, вядома, усё пачалося з дзядулі. Калі я падрос, пачаў усведамляць, што такое вайна, распытваў дзеда пра яго баявы шлях. Але больш ён расказваў пра гэта свайму зяцю — майму бацьку. Пасталеўшы, я цалкам адсачыў баявы шлях дзядулі па архіўных дакументах. І ён заўсёды рваўся ў бой, нягледзячы ні на што, забяспечваў сувязь у любых умовах», — расказаў суразмоўца.

### «САЛДАТ НАВУЧЫЎ МЯНЕ ЧЫТАЦЬ»

Аляксандр Кавун кажа, што, колькі сябе памятае, столькі і цікавіцца ваеннай справай. Ён з цяплом успамінае, як бываў у бацькі і маці на службе: «Гэта цяпер дэкрэтны водпуск 3 гады, а тады ён быў... ці то паўгода, ці то зусім 3 месяцы. Дамаўляліся з бабулямі, суседкамі. А бывала так, што ніхто не мог пасядзець са мною, і бралі на службу. Нярэдка са мной заставаліся салдаты, адзін з іх быў з педагагічнай адукацыяй, дык ён мяне чытаць навучыў. Заўсёды глядзеў на бацьку з захапленнем, калі бачыў яго ў форме. Ён шмат расказваў пра службу, і мне было ўсё-ўсё цікава. Хоць ён першапачаткова жадаў быць ветэрынарным урачом, адвучыўся ў тэхнікуме. А ў 1951-м яго прызвалі на тэрміновую службу, якая тады доўжылася 5 гадоў. Праз год службы накіравалі ў Яраслаўскае зенітна-ракетнае каманднае вучылішча. Бацька заўсёды казаў: ні разу не пашкадаваў, што яго шлях быў звязаны з арміяй. З мамай, як тады часта бывала, яны пазнаёміліся на танцах. Здарылася каханне, пажаніліся, натуральна, маці пераехала да бацькі, уладкавалася працаваць у машынапіснае бюро. Камп'ютараў не было, усе дакументы набіраліся на друкавальных машынках».



Сястра майго суразмоўцы скончыла медыцынскае вучылішча і па размеркаванні трапіла ў тую вайсковую часць пад Масквой, у якой працавалі іх бацькі. Там жа яна пазнаёмілася са сваім будучым мужам, які быў камандзірам роты ў сяржанцкай школе. Яны ажаніліся, служылі і гадавалі дзяцей.

### ІНШЫХ ВАРЫЯНТАЎ НЕ БЫЛО

Аляксандр Кавун адзначыў, што ніякіх іншых варыянтаў, акрамя арміі, не разглядаў, хаця выбар быў. Мог пайсці ў сельскагаспадарчую сферу ці стаць хімікам, здольнасці меліся сур'ёзныя. «У нас у школе была вельмі моцная настаўніца хіміі. Яна арганізавала хімічнае таварыства, якое курыраваў Маскоўскі хіміка-тэхналагічны інстытут. І калі быў у 10 класе, да нас прыязджаў рэктар і прапаноўваў навучанне, паступленне без іспытаў. Але цвёрда вырашыў быць ваеннаслужачым. Праўда, я хацеў стаць лётчыкам, але не прайшоў па здароўі. Таму вырашыў пайсці па шляху бацькі і паступіў у тое ж вучылішча, што і ён», — паведаміў Аляксандр.

Магчыма, у вас, чытачоў, узнікла пытанне: у які перыяд жыцця Аляксандр Кавун аказаўся ў Беларусі? А адбылося гэта пасля заканчэння вучылішча. Вучыўся ён вельмі добра, і яму прапанавалі служыць у Беларусі. «Я быў не супраць, але сказаў, што, калі з Беларуссю не атрымаецца, хачу на Поўнач. Дакладнага месца размеркавання ніхто з нас не ведаў да самага апошняга моманту. Гэта трымалася ў сакрэце. Мяне накіравалі ў Мінск і там — на пасаду камандзіра ўзвода ў 115-ю зенітна-ракетную брыгаду ў Брэсцкай вобласці. І першае маё месца службы было ў пасёлку Відамля», — успамінае ён.

### «ЖОНКА ЗАЎСЁДЫ БЫЛА СА МНОЙ»

Аляксандр меў магчымасць вярнуцца на радзіму, але вырашыў застацца ў Беларусі. Пасля Брэста пайшоў на павышэнне, служыў пад Гроднам, дзе і стварыў сям'ю, тут жа нарадзіўся яго першынец. Як маладой сям'і ім далі двухпакаёвую кватэру. Так пара Кавун жыла да 1991 года, потым Аляксандра накіравалі служыць на Поўнач. «Я ж хацеў калісьці, — усміхаючыся, кажа ён. — Служыў на Кольскім паўвостраве з 1991 да 1995 года. Вядома, паехалі ўсёй сям'ёй. Кватэру я забраніраваў на той выпадак, калі вырашу вярнуцца. І калі служба на Поў-

### ДЗЕЦІ САМІ ЗРАБІЛІ ВЫБАР

У Аляксандра і Галіны нарадзіліся двое сыноў. Абодва служылі на тэрміновай службе. Старэйшы, Аляксей, вырашыў працягнуць справу бацькі і пайшоў па яго шляху. Хаця таксама былі іншыя варыянты, але рашэнне аказалася цвёрдае. Паступіў у Ваенную акадэмію на пагранічны факультэт. «Я ніяк не ўплываў на рашэнні сыноў адносна іх будучай прафесіі. Дзеці павінны самі абраць, чым займацца па жыцці, — падкрэслівае Аляксандр. — Калі старэйшы сын сказаў, што хоча быць ваеннаслужачым, я проста пагаварыў з ім аб цяжкасцях прафесіі і спытаў, ці сапраўды ён гатовы да іх. Ён сказаў, што гатовы. Усё, далей я толькі падтрымліваў. Малодшы выбраў для сябе іншую сферу, у чым я яго таксама цалкам падтрымаў. Бо заўсёды памятаю словы дзядулі. Ён казаў, што, калі ідзеш на працу ці службу з задавальненнем, значыць, ты на сваім месцы. А калі будзеш ісці як на катаргу, дык навошта табе такая работа?»

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 14 октября 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Янки Мавра, 34 У-403, микрорайон «Заболоть» 440100000002008263** | 0,0977 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 10 %. Фундамент: железобетон; наружная площадь (площадь застройки): 240 (240) кв. м | 36 713,17 (9 259,47; 27 453,70) | 369,15 | 7 300,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. (при их наличии) и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 03.04.2025 № 249.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 14 октября 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 30 сентября по 8 октября 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

начы скончылася, мы з жонкай сталі думаць: заставацца ў Расіі ці вярнуцца ў Беларусь. Рашэнне прынялі на карысць Сінявокай. І ні разу не пашкадавалі. Краіна прыняла як родных. Ужо большая частка майго жыцця прайшла тут. Гэта мой дом».

Жонка Аляксандра, Галіна, заўсёды ішла за ім. У яе ніколі пытанняў не ўзнікала: ехаць ці не. Быў толькі адзін невялікі перапынак, калі яны не жылі разам. На Поўнач мой суразмоўца спачатку паехаў адзін, каб вырашыць пытанні з жыллём. Старэйшаму сыну — два з паловай гады. Калі ўсё было гатова да прыезду сям'і, жонка і дзеці прыехалі да Аляксандра. «На Поўначы мы мянялі месца жыхарства тры разы, і жонка заўсёды са мной. Вядома, для яе было шмат нязручнасцяў, але мы жылі вельмі дружна і падтрымлівалі адно аднаго. Ды і прырода неверагоднай прыгажосці, вельмі добрыя людзі жылі побач з намі», — адзначыў суразмоўца.

## УСЁ Ў РУКАХ МАЛАДЫХ

У ваенным камісарыяце актыўна займаюцца ўвекавечаннем памяці абаронцаў Радзімы. Адным з прыярытэтных кірункаў з'яўляецца пошук без вестак зніклых салдат. Да гэтай важнай задачы прыцягваюць моладзь, расказваючы пра подзвігі нашых продкаў і пра тое, як важна захоўваць памяць. «Радзіма — гэта больш, чым краіна. Гэта твае блізкія, сям'я, дзеці, жонка. Гэта аб'ёмнае паняцце. Таму, вядома, адчуваю пачуццё патрыятызму да Беларусі. На мой погляд, любы мужчына павінен умець бараніць Радзіму. Я сваіх дзяцей навучыў думаць такім жа чынам. Цяпер вучу ў цэлым маладое пакаленне. Гэта вялікі пласт маёй работы. Бо ўсё ў руках маладых», — разважае Аляксандр.

Работа з моладдзю ў камісарыяце пачынаецца з вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Дзецям расказваюць пра тое, як шукаць астанкі загінулых, тлумачаць, што такое вайна, яе жахі і наступствы. Паступова яны пачынаюць разумець, наколькі важна памятаць і шанаваць тых, хто аддаў сваё жыццё на крывавых палях вайны. «Калі мы знаходзім астанкі салдата, стараемся як мага больш даведацца пра яго жыццё. Вывучаем архіўныя дакументы, каб зразумець, кім быў гэты чалавек, як ён аказаўся на фронце і як загінуў. Мы расказваем пра гэта дзецям, каб яны маглі ўбачыць, што за кожным знойдзеным загінулым стаіць рэальная гісторыя чалавека, які хацеў жыць, але аддаў сваё жыццё за Радзіму», — падзяліўся суразмоўца.

У камісарыяце гэтую работу будуць працягваць, бо гэта абавязак перад тымі, хто змагаўся за нашы свабоду і незалежнасць. Важна, каб памяць пра іх жыла ў сэрцах дзяцей і ўнукаў, каб яны заўсёды памяталі пра тое, што такое сапраўдная любоў да Радзімы і гатоўнасць яе абараняць.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**Фота з архіва Аляксандра Кавуна.**

# СВЕДЧАННЕ ВЯЛІКАЙ ТРАГЕДЫІ




## Каля якога экспаната ў Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ніхто не праходзіць міма?

Унікальны прадмет прадстаўлены ў экспазіцыйнай зале № 4 музея, прысвечанай абарончым баям на тэрыторыі Беларусі. Нікога не пакіне абыякавай салдацкая біклажка, унутр якой уціснутая чалавечая костка. Экспанат з'яўляецца своеасаблівым сімвалам музея, вялікай трагедыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Прадмет быў знойдзены ў 1992 годзе байцамі пошукавага атрада «Бацькаўшчына» каля вёскі Азярніца Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. У гэтым месцы летам 1941 года трапіла ў акружэнне 10-я армія Заходняга фронту. Што адбывалася ў так званым беластоцка-слонімскім катле, можна ўявіць, гледзячы на гэты прадмет. Мяркуецца, што баец быў раздушаны варожай тэхнікай. Экспанат прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі, пачынаючы з 1995 года.

«Кожны наведвальнік звяртае ўвагу на тое, як аформлена гэта частка экспазіцыі, — расказвае **загадчыца культурна-адукацыйнага аддзела Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярына КАТЛОЎСКАЯ.** — Апаленыя вайной дошкі — сімвал разбураных гарадоў і сельскіх населеных пунктаў. На заднім плане — пашкоджаныя агнём фотаздымкі воінаў. Тыя, хто адлюстраваны на іх, лічацца зніклымі без вестак. Гэта толькі маленькая частка савецкіх ваеннаслужачых, якія беззваротна зніклі ў далёкім 1941 годзе».

Толькі на Слонімшчыне ў першыя дні вайны загінула каля 60 тысяч чырвонаармейцаў. Па інфармацыі пошукавага атрада «Бацькаўшчына», каля 5,5 тысячы байцоў пахаваны ў брацкіх магілах, імёны большасці з іх невядомыя.



Удзельнікі грамадскага аб'яднання ўносяць вялікі ўклад у справу захавання памяці: падымаюць астанкі ваеннаслужачых, устанаўліваюць іх імёны, з ушанаваннямі перазахоўваюць у брацкія магілы. Гэтаму папярэднічае вялікая работа з архіўнымі дакументамі, фотаздымкамі.

Паміж Белдзяржмузеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам, пошукавымі атрадамі краіны наладжана шчыльнае ўзаемадзеянне: найбольш каштоўныя рэчы таго часу папаўняюць фондавыя запасы, прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі. Нягледзячы на тое, што пасля вайны прайшло шмат часу, прыносяць у музей экспанаты і звычайныя грамадзяне.

«Штогод у музей паступае звыш тысячы новых музейных прадметаў: пачынаючы ад пісьмаў, узнагарод і заканчваючы прадметамі ваеннай археалогіі, — адзначае Кацярына Катлоўская. — Вядома, кожны прадмет праходзіць экспертызу. Калі яна пройдзена, ствараецца пашпарт экспаната, ён бярэцца на ўлік. Прымаюцца музеем і прадметы пасляваеннага часу, якія адлюстроўваюць складаны адначасна перыяд. Для нас каштоўны кожны экспанат».

Калектыў Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны мае традыцыю — кожнае 22 чэрвеня праводзіць каля біклажкі з уціснутай косткай мерапрыемства, прысвечанае самаму страшнаму дню ў годзе. Супрацоўнікі пераўвасабляюцца ў гарадскіх жыхароў, франтавікоў і ўзнаўляюць падзеі пачатку Вялікай Айчыннай. Каля гэтага экспаната, які сімвалізуе пакуты і боль беларускага народа ў гады акупацыі, запальваецца свечка ў памяць аб усіх тых, хто не дачакаўся Перамогі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-22919, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, д. 50. Площадь – 4056,3 кв. м. Наименование – Здание административно-хозяйственное, литер А 7/к-кп. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000009007867, площадью 0,1422 га, предоставленном ОАО «Минский завод Термопласт» на праве аренды (срок действия: по 30.04.2031). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0133 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0230 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0038 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **7 500 000,00** | **Задаток, BYN** | **750 000,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 133 03 33 (Елена) | | | | |
| **Сроки подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Иные условия** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан не позднее 1 (одного) рабочего дня с даты государственной регистрации перехода права собственности на капитальное строение (Лот № 1) заключить с продавцом договор безвозмездного пользования частью капитального строения (Лот № 1), площадью 356,6 кв. м (кабинеты 1 этажа) сроком на 3 (три) года, а также заключить соглашение об установлении безвозмездного бессрочного сервитута на вестибюль 1 этажа | | | | |

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 10 октября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **13 октября 2025 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | |



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6800 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 60,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новосёлковский с/с, д. Прончаки, пер. Садовый, 16, на земельном участке с кадастровым номером 125083606101000051, площадью 0,2874 га, составные части и принадлежности: одна пристройка, одна веранда, два бетонных погреба, один бревенчатый, один шлакобетонный и два дощатых сарая, одна дощатая уборная, колодец, ограждение | | | |
| **Начальная цена, руб.** | **177,39** | **Размер задатка, руб.** | **17,74** |

**Продавец:** ОАО «Путь новый», 225374, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новоселки, ул. Центральная, 14, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости за Объект до заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 29 октября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 октября 2025 г. до 17.00**



**В связи с утерей считать недействительными:** бланки страховых свидетельств по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев ТС на территории РБ серии: ТА 6790622, ТА 6790623, ТА 6790628, ТА 5776100, ТА 4102492, ТА 4154921, ТА 5743486; страховых полюсов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (форма 2РН, 2РП) серии БМ 1521242, БМ 1508631, БМ 1514123; полис пограничного обязательного страхования гражданской ответственности владельцев ТС на территории РБ серии РВ 1446617.

УНП 100706519

# СУМАВАЦЬ НЕ ДАВЯДЗЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ДЗЕЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАТЭНЦЫЯЛУ

«У нашым аддзяленні працуе 47 гурткоў і клубаў, — расказвае **Ала РАДЗІВОНАВА, загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для пажылых грамадзян.** — Працуем у адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй Рэспублікі Беларусь «Актыўнае даўгалецце — 2030», мэта якой — зрабіць усё, каб нашы грамадзяне пажылога ўзросту жылі бадзёра, ярка, прыгожа. Для гэтага мы займаемся прафілактыкай кагнітыўных парушэнняў, прапагандай здаровага ладу жыцця, падтрыманнем сацыяльнай і фізічнай актыўнасці пажылых грамадзян і, вядома ж, рэалізацыяй іх творчага патэнцыялу».

На пастаяннай аснове аддзяленне Савецкага раёна наведвае каля 700 чалавек. Яшчэ некалькі сотняў зазіраюць на асобныя мерапрыемствы ці пасяджэнні клубаў. Большасць з іх праводзяць валанцёры сярэбранага ўзросту — іх каля трыццаці, у многіх ёсць альбо профільная адукацыя, альбо шматгадовы досвед у абраным імі кірунку. Вялікай папулярнасцю сярод пенсіянераў карыстаецца гурток па вывучэнні англійскай мовы. Цікавы шматлікім і «Фітнес для розуму», галоўная задача якога — прафілактыка дэменцыі і кагнітыўных расстройстваў. З жадаючых запісацца на яго выбудоўваецца цэлая чарга. Як і на запіс у школу-студыю мадэлінгу «Новая я», дзе жанчын 60+ навучаюць фотапазіраванню, тэхніцы маўлення, прамоўніцкаму майстэрству і ўрокам стылю. А паспрабаваць сябе ў бальных, лінейных, усходніх танцах і нават аргенцінскім танга можна аж у 13 гуртках тэрытарыяльнага цэнтра.



## ТАНЦУЮЦЬ УСЕ!

Па словах загадчыцы аддзялення дзённага знаходжання цэнтра, часта пенсіянеры даведваюцца аб іх установе з сацыяльных сетак. Іншыя прыходзяць па рэкамендацыях сяброў і знаёмых, а часам кантакты ТЦСАН даюць у паліклініках: «Доктар сказала: рухайся, танцуйце. Вось я і прыйшла. Хоць і была ўпэўнена, што гэта абсалютна не маё, — распавядае Галіна Іванаўна, удзельніца танцавальнага гуртка. — Цяпер не проста рухаюся, але і выходжу на сцэну». Прычым танцавальныя калектывы цэнтра вядомыя і за яго межамі. Напрыклад, «Дэжавю», у якім выступае Галіна Іванаўна, запрашаюць на гарадскія святы, тэматычныя канцэрты. Сёлета ўдзельнікі нават з'ездзілі на «Славянскі базар». «Гэта цудоўна, што дзяржава дае магчымасць пажылым займацца ў такіх гуртках бясплатна, — гавораць удзельнікі танцавальнага калектыву. — Нашы знаёмыя з Грузіі, Арменіі і іншых краін зайздросцяць: гавораць, там такога няма».

Рэпертуар «Дэжавю» разнастайны: ёсць элементы і сальсы, і лаціны, і танга. Але кожны танец калектыву абавязкова мае драматычны складнік, расказвае гледачам цэлую гісторыю. Атрымліваецца амаль што пастаноўка, міні-мюзікл. І ўсё гэта — пад песні 70-х і 80-х гадоў, папулярных дагэтуль: «Мы бяром не сучасныя кампазіцыі, а даўно знаёмыя. Таму і калектыў наш так назвалі. Людзі песні пазнаюць, пачынаюць падпяваць, усміхаюцца, — адзначае кіраўнік гуртка Георгій Георгіевіч. — Рухі таксама падбіраем з нашай маладосці — падобныя на тыя, як танцавалі гадоў 30 таму. І самі, вядома, атрымліваем ад усяго працэсу вялікае задавальненне».

## ВЕДЫ ДЛЯ ДУШЫ

Да прыходу ў ТЦСАН Марына Леанідаўна шмат гадоў працавала са студэнтамі, выкладала англійскую мову. На пенсіі спачатку сама наведвала розныя заняткі — па аздараўленчай гімнастыцы, прафілактыцы кагнітыўных парушэнняў, — а паўтара гады таму сама стала кіраўніком гуртка па вывучэнні англійскай мовы: «Працаваць з людзьмі, якія насамрэч хочуць вучыцца, — велізарнае задавальненне. Студэнты часта робяць гэта толькі дзеля заліку ці экзамену, а тут займаюцца для сябе, для душы — і я як выкладчык гэта адчуваю, — дзеліцца Марына Леанідаўна і падкрэслівае: — Узроставага бар'еру ў нас няма, мы разумеем адзін аднаго, ніхто нікога не крытыкуе. Кожнае новае слова, кожны тэкст выклікаюць водгук і цікавасць. Калі я толькі пачынала курс, то не чакала, што мае вучні будуць так старанна весці сшыткі і слоўнікі, настолькі адказна ставіцца да заняткаў».

Мэты навучання ва ўсіх розныя. «Я раней добра размаўляла па-англійску, бо шмат падарожнічала па Еўропе. З тых часоў мінулі гады, усё прызабылася, але ў паездках за мяжу мова ўсё роўна патрэбна. Каб пагутарыць у кавярні, спытаць дарогу ці проста паразмаўляць з людзьмі на вуліцы. І каб усё — без размоўніка», — прызнаецца Тамара, адна з удзельніц гуртка. Яна перакананая: вывучэнне замежнай мовы яшчэ і выдатна развівае памяць, што проста неабходна ў пажылым узросце: «На занятках мы пішам сачыненні, чытаем апавяданні. Прычым на зусім розныя тэмы — напрыклад, аб беларускіх традыцыях і святах. Гутарым, даведваемся шмат новага, у тым ліку і аб жыцці, культуры і гісторыі роднай краіны».

## У ГАРМОНІІ З ЦЕЛАМ

У ТЦСАН Савецкага раёна працуе 10 фізкультурна-аздараўленчых гурткоў. У іх займаюцца і аздараўленчай, і дыхальнай гімнастыкай, і гімнастыкай цыгун. Раз у тыдзень праходзяць заняткі ёгай: медытацыям, дыхальным тэхнікам і асанам — спецыяльным позам — на пастаяннай аснове навучаюцца каля 10 чалавек. Астатнія ж прыходзяць час ад часу, наведваюць свабодна. Самай старэйшай вучаніцы ўжо 84 гады. «Ёга добрая тым, што дае не толькі аздараўленне целу, але і, што галоўнае, веды, асабліва, як кіраваць сваімі эмоцыямі, пачуццямі. Я лічу, гэта жыццёва важныя рэчы, якія дапамагаюць на кожным кроку. Калі пазнаеш, як працуе розум, як захоўваць спакой, жыццё становіцца лягчэй. У тым ліку і ў нашым узросце», — усміхаецца Ірына. Жанчына кіруе гуртком ужо шосты год — спачатку прыйшла падмяніць калегу, а потым і сама стала валанцёрам у цэнтры.

Гурток, які яна вядзе, даўно стаў нечым большым, чым проста клубам па інтарэсах. Тут заўсёды ёсць месца жарту, падтрымцы і цёпламу слову. Пенсіянеры прызнаюцца: сустрэчы дапамагаюць не адчуваць сябе адзінокімі, даюць сілы і жаданне рухацца далей. Адна з удзельніц, Інеса, распавядае: «Калі я выйшла на пенсію ў 72 гады, зразумела, што трэба нечым сябе заняць, каб не сядзець цэлы дзень каля дома на лаўцы. Даведалася пра гурткі ў тэрытарыяльным цэнтры, і чамусьці душа пацягнулася менавіта да ёгі. Зараз дома з унучкай таксама ёю займаемся. Думаю, такія гурткі дапамагаюць нам, пажылым людзям, захоўваць рухомасць, быць у форме, заставацца «на плаву» і працягваць цікавіцца чымсьці новым».

**Аміна НАЗАРАВА.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# КАШТОЎНЫ РЭСУРС НАЙМАЛЬНІКА

## Кожны пяты пенсіянер працягвае працаваць

Агульная колькасць пенсіянераў у краіне складае 2,4 мільёна чалавек. Расходы на выплату пенсій штогод складаюць каля 9 % ВУП, і сёлета на гэтыя мэты будзе выдаткавана 26 мільярдаў рублёў, паведаміла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА. Сёлета ўсе працоўныя пенсіі павышаліся ўжо двойчы: у лютым — на 10 %, у верасні — на 5 %. Сярэдні памер працоўнай пенсіі сёння складае 980 рублёў.

Многія пажылыя людзі ў краіне прымаюць рашэнне працягваць актыўную працоўную дзейнасць. Кожны пяты пенсіянер працуе, а гэта 472 тысячы чалавек. З пачатку года іх пабольшала на 15 тысяч, у тым ліку дзякуючы ўказу кіраўніка дзяржавы, якім былі зняты абмежаванні па памеры пенсій працоўным пенсіянерам. Паколькі сёння наймальнікі зацікаўлены ў людзях старэйшага пакалення, нядаўна ў Закон аб занятасці былі ўнесены змяненні, накіраваныя на падтрымку грамадзян, якім да наступлення агульна ўстаноўленага пенсіённага ўзросту засталося пяць і менш гадоў.

У прыватнасці, гэта захаванне для дадзенай катэгорыі выплаты дапамогі па беспрацоўі цягам шасці месяцаў (для астатніх катэгорый гэты перыяд скарочаны)

З 29 верасня да 3 кастрычніка па ўсіх рэгіёнах краіны пройдуць «сярэбраныя» кірмашы вакансій — іх запланавана 156. Напрыклад, летась такія кірмашы наведала каля 5,5 тысячы чалавек, а кожны трэці дамовіўся пра далейшае працаўладкаванне. Сёлета на працягу 8 месяцаў садзейнічанне ў працаўладкаванні атрымалі амаль 4 тысячы людзей перадпенсіённага і пенсіённага ўзросту.

На фарміраванне камфортнага ўзроўню даходу накіравана праграма дадатковай назапашвальнай пенсіі «3+3». Па стане на верасень заключана 59 тысяч дагавораў дадатковага страхавання.

**Алена КРАВЕЦ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит открытый повторный аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»**

